Б2 204

№ 5. Выданьне „Нашае Хаты“ № 5.

Коштам Т. Г.

## М. ГОРКІЙ

# АРХІП і ЛЯВОНКА

З расейскаго перэлажыла ЗЯЗЮЛЯ.

Рысункі Янiслава Валакіты.



ВІЛЬНЯ 1910.

Б2 204

21 094

М. ГОРКІЙ

# АРХІП І ЛЯВОНКА

З РАСЕЙСКАЙ МОВЫ ПЕРЭКЛАЛА НА БЕЛАРУСКУЮ

Т. Г.

Инв. 1953 г. б 204

Бел. аддзел 1994 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

ВІЛЬНЯ 1910



Чэкаючы на паром, ляглі яны ў цяньку пад падмытым і навісшым берэгам і доўга моўчкі глядзелі на шыбкіе і каламутные хвалі Кубані*), плёскаўшыеся ля іх ног.

Лявонка заснуў ткі той час, а дзеда Архіпа ніяк сон ня браў: усё ў грудзёх нешта балело. На цёмна-шэрай зямлі абарваные, скорчэные яны чуць адзначываліся і выглядалі, як два камочкі, адзін — большы, другі — меншы. Іх твары, загарэўшые ад сонца і ў пылу, так сама бадай нічым ня розніліся ад бруднаго шкуцьця, накінутаго на іх плечы.

Кашчавы і доўгі дзед Архіп выцягнуўся як раз праз вузенькую пешчаную сьцежку, што, як жоўтая стужка, раскінулась памеж абрывам і берэгам рэкі. Лявонка скруціўся ў баранак ля яго баку. Тоненькі, хірлявы, ў сваей абарванай опратцы падобен быў да сухога сучка, бытцам адломанаго ад дзеда—старога пня, выкінутаго на пясок халоднымі і моцнымі хвалямі рэкі.

Дзед, успершыся на руцэ, паглядаў на другі берег, залітый сонцэм ды заросшый дробнай лазой, дзе ў адным мейсцы можна было прыкмеціць чорны бок парому. Тамака было неяк сумна і пуста. Шырокая шэрая дарога вела далёка ў глыбь стэпоў, дый ішла яна так проста, што ажно на дзеда наводзіла нудные думкі.

Тухлые яго вочы с чырвонымі запухшымі векамі міргалі неяк неспакойна, а зморшчэны твар бытцам застыў у болі, ў журбе. Сухі кашэль хватаў яго безпрэстанку; хутка

*) Рэка на Каўказі.

тады закрываў рот рукой ды непакойна, са страхам паглядаў на ўнука свайго: а вось прачнецца?! Кашэль быў гэткі сіпучы ды цяжкі, што прымушаў дзеда падымацца з зямлі,— а тады сьлёзы капалі з яго вачэй.

Каб ня дзедавы кашэль, ды шум вады, дужа-б ціха было у стэпі, не чутно было-б ніякіх галасоў... Аграмадны буры стэп, спалены сонцэм, шырока раскінуўся па абодвых берэгах рэкі, і толькі далёка — на краю неба чуць-чуць старые вочы маглі пабачыць залатое морэ пшаніцы, што ціха калыхалася у блесках сонейка. На цёмна-сінім небі відаць было тры гонкіе топалі; здавалося, што яны то ніжэюць, то ізноў у гару растуць, а неба і пшаніца, накрытая ім, то падыймаецца, то ізноў к зямлі гнецца,— а падчас усё раптам чэзне ў серэбраным сьцепным тумане...



А туман той сьветлы, бліскучы падпаўзаў блізенька к самому берэгу рэкі ды сам рабіўся чыстай, спакойнай рэкой, што хочэ ажывіць мёртвы ад гарачыні стэп.

Дзед Архіп ішоў здалёку — з глыбіні Расеі; яму былі незнаёмы гэтые дзівы, бо перад тым ніколі ня быў ён у стэпах, куды цяпер загнаў яго голад. Дык дзіваваўся-ж ён, дзіваваўся,—і вочы сабе праціраў, думаючы: „спякота гэтая можэ мне вочы выпаліць, так, як ужо адабрала і апошніе сілы ў нагах".

Сягоньня было яму неяк горэй, як заўсягды. Чуў блізка сьмерць, але яе не пужаўся, бо ведаў, что усё роўна яе не мінаваць. Мучыла яго толькі адна думка — аб ўнуку: куды дзенецца Лявонька?.. І хацелося яму памерці ў сваім баку, а не ў чужым.

Кожын раз, як гэтая думка прыхадзіла дзеду на вум, агортывала яго страшэнная жуда, а ў сярэдзіне нешта быццам абрывалося, хададзело; і гэтак тады рабілося яму сумна на душы, што, здаецца, так і пайшоў-бы ў сваю родную старонку—Расею... Толькі—далёка адсюль да Расеі... ўсё роўна, ня дойдзеш і нейдзе прыдзецца памерці на дарозі. А тутака, на Кубані, шчыра бедных дарадь. Народ усё багаты, толькі неяк цяжкі ды сьмяшлівы. Ня любіць бедных, бо сам багаты.

А Лявонцы прыдзецца пашукаць іншай працы, як сіратой астанецца....

Дзед паглядзеў на яго вільготнымі ад сьлёз вачыма і асьцярожна сваей шэршавай рукой стаў гладзіць унукаву галоўку.

Той падняў свае вялікіе сініе вочы. На худым твары, рабым ад воспы, з вострым носікам і бледнымі вуснамі тые вочы здаваліся ешчэ большымі, ешче глыбейшымі, як былі яны папраўдзі.

— А што, мо йдзе? — спытаўся ён і, прылажыўшы к вочам руку казырком, угледаўся на рэку, залітую сонцэм.

— Не, ешчэ не йдзе. Стаіць на мейсцы. Ня пільна яму, ніхто ня клічэ, і не кратаецца... — ціха прагаварыў дзед. Рука яго ўсё лежала на галоўцы ўнука. — А што, задрэмаў?

Лявонкаківнуў галоўкай і расцягнуўся на пяску. Яны прымоўклі.

— Каб умеў я плаваць, пакупаўся-б, — адазваўся Лявонка, пазіраючы на ваду. — Бач, як быстра коціцца. Нябось, у нас гэткіх нема. І чаго-ж яна так сьпешаецца? Ніхто ня гоніць у нару,—пасьпееш на пару!..

І Лявонка сярдзіта адвярнуўся ад рэкі.

— А ведаеш што? — крыху падумаўшы, сказаў дзед, — давай, распярэзаемся, завяжэм рэмні, адзін канец прывяжу к тваей назе, а тады лезь у ваду і купайся...

— Во, прыдумаў! — атказаў Лявонка. — Гэткая рэка і мяне і цябе сцягне. Патонем абое.

— Праўда, што сцягне! Глядзі, як прэць, не раўнуючы як вясной у паводку! А колькі ж тут сенакосу, — і вокам не абняць!

Лявонка ляніўся гукаць і нічога не атказаў дзеду; цёр толькі ў пальцах камочэк сухой гліны.

А дзед глядзеў на яго ды аб нечым думаў.

— Вось як... — ціха прашэптаў Лявонка, стрэсаючы с пальцоў пыл, — здаецца, крэпкая земля, а расцёр — дык толькі пыл узьняўся, і то чуць відаць...

— Дык што-ж? — спытаўся Архіп і ізноў закашляў; праз сьлёзы угледаўся ў вялікіе бліскучые вочы ўнукавы.

— А вось тое, што яна уся такая... — сказаў Лявонка, паказываючы рукой на другі бераг рэкі. — А колькі на ёй набудована, колькі мы ўжо гарадоў перайшлі?! Страх! А людзей то ўсюды колькі?!

Не ўмеў ён ешчэ акуратна выказаць славамі ўсіх думак сваіх, замоўк і азіраўся навокол.

Спагадзя дзед падсунуўся да ўнука і ласкава загаварыў:

— Вумніца ты мой! Шчырую праўда ты адрэзаў — усё пыл... і гарады, і людзі, і мы с табой — усё пыл... Ай, дзіцятка, каб цябе граматы вучылі, пайшоўбы ты ў гару! Гукаеш аб усём, бытцам стары... Верабейка ты мой, птушэчка мая!... Богу толькі аднаму ведама, што с табой будзе?..

Абняў галоўку ўнука і цэлаваў.

— Пачэкай!.. — крыкнуў Лявонка, аслабаняючы свае льняные воласы ад крывых дрыжачых пальцоў дзедавых рук. — Як ты гэта кажэш? І земля, і гарады, і мы с табой — толькі пыл? Усё пыл?

— Аўжо-ж, нейначэй Бог прыказаў, галубочку ты мой. Усё абернецца ў зямлю, а земля—што? Пыл, больш нічога... І ўсё памірае на ёй... Во як! І дзеля таго чэлавек павінен жыць працавіта, па Божаму. Во і я ўжо хутка памру... — перэкінуўся дзед на думку сваю. — Куды ты тады без мяне дзенешся?

Лявонка часта чуў гэткіе гутаркі і, папраўдзі, надаело яму ужо гукаць аб сьмерці; дык моўчкі адвярнуўся ён у іншы бок, сарваў траўку і пачаў яе жваць.

Але думка аб разлуцы з ўнукам была балючым мейсцэм дзеда.

— Ну, што-ж ты змоўк? Кажы, як будзеш жыць без мяне? — ціха спытаўся, кашляючы ізноў.

— Я-ж ужо гаварыў, — атказаў Лявонка, скоса пазіраючы на дзеда.

Дужа ён не любіў гэтых гутарак, бо заўсягды яны канчаліся сваркай. Бывало, што спачатку слухаў, думаў, пужаўся новых варункоў жыцьця, пасьля плакаў, а як ужо зусім замарыўся, ня слухаў болей, адварочываўся ад дзеда. А дзед, калі прыкмеціць гэта, пачынаў сярдзіта лаяць Лявонку, кажучы, што ён дурэнь, што ня цэніць яго трудоў ды хочэ яго сьмерці.

— Горкі ты ешчэ дурніца, сьвета не знаеш. І ня дзіва: табе-ж усяго толькі адзінаццаць гадкоў. І слабенькі ты, нягодны да работы. Дзе тады дзенешся? Мо думаеш, што добрые людзі прыхінуць цябе? Каб грошы ты меў, тады і апекуны знайшліся-б. сць ведама, па старцох хадзіць ня люба нават і мне старому. Кожнаму кланяйся, кожнаго прасі.

І лаюць цябе, і бьюць, а часта і зусім гоняць... Ці ты думаеш, што нас бедных лічаць за людзей? Ані! Дзесяць год ужо хаджу — знаю гэты смак. Куском хлеба даражаць, бытцам золатам. Дадуць і думаюць, што рай сабе аткрылі на тым сьвеці. Мо думаеш, што з жаласьці даюць? Не,— каб толькі сумленьне свае супакоіць,—дзеля гэтаго і даюць, мой міленькі. Сытый чэлавек безлітосный, беднаму не спагадае. Яны да векоў будуць ворагамі, да векоў будуць адзін аднаму вочы калоць!.. Сытый галоднаму не таварыш.

Усходзіўся гэтак дзед ад злосьці і жалю. Вусны дрыжалі, зрэнькі блішчэлі пад чырвонымі векамі, а моршчыны на твары зрабіліся ешчэ большые, ешчэ глыбейшые.

Лявонка гэткім дзядулю не любіў, ён нават пужаўся яго.

— Ну, і скажы-ж ты мне, што ты без мяне будзеш рабіць на сьвеці? Ты—гэткая крошэчка, а сьвет—зьвер. І праглынець ён цябе адразу. Я не хачу гэтаго!.. Люблю цябе, дзіцятка мае роднае... Адзін ты у мяне, і я у цябе адзін... А паміраць ткі трэба старому, нічога ня зробіш... На каго-ж я цябе пакіну?.. Божэ ты мой, Божухна!.. Чаму не пажалееш ты мяне? Жыць мне ня змога, дый паміраць нельга... Дзіцятка малы... Пеставаў цэльные сем год... Памажы ты мне, Божэ!..

Дзядуля сеў і загаласіў; ушчаміў галаву памеж каленамі, што хадыром хадзілі, ды гэтак плакаў, што аж плечы падымаліся; горкіе сьлёзы, здаецца, так і пяклі хворые грудзі.

Рэка каціласся быстра і с шумам плёскалась аб берэг, бытцам хацела заглушыць дзедавы стогны. А безвоблачнае неба весела сьмеялося, ліло жар на зямлю ды спакойна слухало шум каламутных хваль рэкі.

— Годзі плакаць, дзядуля! — неяк сурьёзна, зьвярнуўшы галаву на бок, сказаў Лявонка і гукаў далей з сумным, хмурным тварам: Гутарылі мы ужо аб усём. Ведаю добра, ня згіну. Пойду дзе небудзь служыць...

— Забьюць... — ледзь праз зубы працэдзіў дзед.

— А вось і не забьюць, ня дамся! — задорліва крыкнуў Лявонка. — І ў людзі выйду, ня кажному паддамся!..

Аж раптам сцішэў, задумаўся ды ціха дадаў:

— А не, то Богу пачну маліцца...

— Каб у манастыр! — за ім у сьлед уздыхнуў і дзед, толькі ізноў узяў яго кашэль ды не даваў спакою.

Разам над іх галавамі разнёсся нейкі крык, і пачулі яны скрып ад калёс.

— Давай паро-о м!.. Па-ро-ом дава-ай! — гукнулі нейчые крэпкіе грудзі.

Уздрыгнулі нашые жэбракі, ўскочылі і падабралі свае торбы і кіёчкі.

Заскрыпела на пяску арба (воз на двух колах),— а ў ёй стойма трымаў лейцы казак. Падаў ён у зад галаву ў вялікай, махнатай авеччай шапцы, надзетай на-бок, ды, набраўшы цэльнай губой духу, каторы надуў і без таго шырокую грудзь, маніўся ужо крыкнуць ешчэ раз. Белые зубы яго сьвеціліся памеж вусамі і чорнай барадой, што аж пад самые вочы шчыльна абрастала твар, наліўшыйся крывёю ад натугі. Разшпіліўшаяся на грудзёх кашуля аткрывала цела, цёмнае ад загару і паросшае валасамі. Як ад яго, гэтаго сілача, так і ад аграмаднаго каня і кованых калёс нясло сілай, багацьцем, здароўем.

— Гэй!.. гэй!..

Дзед і ўнук моўчкі знялі шапкі і нізка пакланіліся.

— Як маецесь! — громка гукнуў падарожны і, пагледзеўшы на той берэг, з якога памаленьку выпаўзаў ужо паром, пачаў акуратна абгледаць бедных. — Адкуль Бог нясе?

— З Расеі! — атказаў Архіп ды ізноў пакланіўся.

— А што, голад тамака у вас?

Саскачыў ён с калёс і пачаў падцягіваць рэмні ў хамуце.

— Ай, голад такі, што і тараканы з голаду дохнуць!

— Ха, ха! Кажэш, і тараканы дохнуць? Відаць, усё ўжо тамака акуратна паелі, калі нават тараканам не асталося крошэк! А да працы, дык пэўне вы гультаі. Гэта ж вядома, што калі будзем добра працаваць, тады і з голаду ня прыйдзецца паміраць.

— Земля то у нас кепская: упіраецца — нічога ня родзіць. Увесь клёк ужо з яе выцягнулі.

— Земля? — пакруціў казак галавой. — Земля заўсягды павінна радзіць, на тое яна і дана чэлавеку, каб радзіла. А бываў ты, дзед, за Чорным морэм? Тамака і жвір аруць!

Паром пад'ехаў.

Два казакі, гладкіе ды чырвоные, з натугай апіраліся нагамі аб паром і трымалі канат ў руках. Паром ажно затрэшчаў, як стукнуўся аб берэг. Тады кінулі яны канат ды пачалі адсопывацца.

— Горача? — спытаўся падарожны, усьмехаючыся і чуць падымаючы шапку, ды узвёў на паром каня свайго.

— Аўжо ж! — атказаў адзін перэвозчык і, падыйшоўшы да воза, пачаў тамака нешта сачыць вачыма.

Другі, сеўшы на падлогу, пачаў, крэхчучы здымаць бот.

Дзед з унукам узыйшлі на паром, сталі сабе з боку і пагледалі на казакоў.

— Ну, едзем! — камандаваў гаспадар воза.

— А піць з сабою нічога не вязеш? — спытаўся той, што агледаў воз. Яго сябр, зняўшы бот і прыжмурыўшы вочы, пачаў абгледаць галеністчэ.

— Не! А ціж табе мала вады ў рэцэ?

— Вады!.. я кажу не пра ваду..

— А, пра гарэлку? Не вязу гарэлкі.

— Як жэ ты гэта яе не вязеш? — сказаў перэвозчык, апусьціўшы вочы.

— Нутка, валяй!

Казак плюнуў на руку і ўзяўся за канат. Падарожны пачаў пасабляць яму.

— А ты, дзед, чаму не пасобіш? — спытаўся Архіпа перэвозчык з ботам.

— Родненькі, куды гэта мне! — ледзь прастагнаў дзед жалосным голасам.

— І ня трэба памагаць, самі справяцца!

Сказаўшы гэта, перэвозчык сам расцягнуўся на памосьці, бытцам хацеў паказаць дзеду, што і праўды тые без іх помачы абойдуцца.

Другі перэвозчык вылаяў яго, але, не атрымаўшы ніякога атказу, упёрся з усіх сіл нагамі аб паром.

Ішлі яны проці вады; яна сярдзіта біла ў бакі парома, знасіла і ходу унімала.

Лявонка углёдаўся ў ваду, і пачало яму ў галаве крущіцца, прычыніліся вочы ад мірганьня хваль, сон стаў яго марыць. А глухі шопат дзеда, скрып каната ды плесканьне хваль — усё гэта так і калыхало да сну; так і хацелося яму легчы на памост. Разам нешта моцна ударыло аб паром, ажно Лявонка упаў на падлогу. Адчыніліся тады шырэй яго вочы, ды пачалі навакол разгледацца. Над ім сьмеяліся казакі, дружна падпіхаючы паром к абгарэўшаму пню, ўкопанаму на берэзі.

— А што, заснуў ты, бедак? А які хірлявы! Лезь лепей на воз, давязу да станіцы (вёскі). А і ты, дзед, седай.

Дзед, падзякаваўшы казакам, пачаў падохківаючы ўзбірацца на воз. Лявонка так сама ўскочыў туды, і шпарка паехалі яны па дарозі, падыймаючы цэлые хмары пылу, ад каторага кашэль пачаў мучыць дзеда.

Казак зацягнуў песьню. А пеяў ён неяк адменна, то абрываў пасяродку, то ізноў канчаў песьню, пасьвістываючы. Здавалося, што ён бытцам зматываў нітку з клубка, а на вузлах зрываў яе.

Колы скрыпелі, пыл знімаўся; дзед пакашліваў ды трос галавой, а Лявонка думаў, што вось-вось даедуць, і пры-

дзецца ізноў завадзіць малітвы: „Матка нябесная, Езус Хрыстус“. Ізноў мальцы будуць яго штурхаць, а бабы дакучаць уселякімі пытаньнямі. Прыкра тады глядзець і на дзеда: ён і моршчыцца болей, і горбіцца ніжэй, і кашляе часьцей, і гукае аб гэткіх рэчах, аб якіх нігдзе і ніколі ня чулі... Кажэ, напрыклад, што ў Расеі проста на вуліцах народ марнее з голаду гэтак, што і падбіраць ужо нема каму. Нічога гэткага яны папраўдзі і ня бачылі. але, не зманіўшы, нічога і не дастанеш. А што з гэтымі кускамі хлеба рабіць? Дома дык можна прадаць за якіе сорак або пяцьдзесят капеек пуд, а тутака ніхто не купляе. І выходзіць, што часта трэба кідаць у стэпі і добрые кускі смашнаго хлеба. Самім ня змога ўсяго з'есьці, а насіць цяжка.

— Пойдзеце збіраць? — спытаўся дзеда казак.

— А ўжож! — уздыхаючы атказаў дзед.

— Устань, пакажу, дзе мая сьвятліца,—зайдзіце начэваць.

Дзед узняўся, але назад ізноў зваліўся ды пабіў сабе бок. Застагнаў глуха, паціраючы балючае мейсцэ.

— Ах, стары ты, стары! — з жалем буркнуў казак. — Усё роўна, не ўставай: як сцямнее ды прыйдзе пара начэваць, папытайся тады Чорнаго, Андрэя Чорнаго — гэта мае прозьвішчэ. Кожын пакажэ. А цяпер злезай. Бывайце здаровы!

Дзед і ўнук стаялі цяпер каля трох топалей. Памеж пнёў іх бачылі яны стрэхі, платы ды гэткіе самые топалі. С пад пылу трудна было і спазнаць гатунак лісьцёў, а кара дык зусім палопалася ад спекоты.

Як раз проста перад ім, памеж двума густымі платамі ішла вузкая вулочка, ў каторай счэз той казак, што іх тутака прывёз. Доўга не міркуючы, і яны пацягнуліся яго сьледам; а ішлі, як якіе падбітые пешэходы, валачылі ногі ды зумысьля хісталіся.

— Ну, як мы пойдзем: разам, ці па-асобку? — спытаўся Лявонку дзед, ды, не чэкаючы атказу, сам пастанавіў: — разам лепей пойдземо, бо табе вельмі мала даюць. Не умееш прасіць...

— А на што ж нам шмат? Усё роўна, не з'емо...— сумна атказаў Лявонка і аглянуўся навокол, каб хто часам не пачуў.

— На што? Во, ці бачыў! А мо' знойдзецца такі, што купіць? Вось на што! Грошы тады даюць. А грошы—вялікая рэч; з імі, нябось, ня згінеш, калі памру я.

І пачаў дзед ласкава гладзіць ўнукаву галоўку.

— А як табе здаецца, колькі я ў гэтай дарозі назбіраў?

— А колькі? — без ніякой цікавасьці спытаўся Лявонка.

— Адзінаццаць с палавінай рублёў!.. Чуеш?!

Лявонку аднак не усцешылі ні гэтые грошы, ні вясёлая дзедава гаворка.

— А, ты, малы, малы! — уздыхнуў дзед. — Ну, значыцца, як пацягнемся?

— Па-асобку.

— Дык ля церквы спаткаемся.

— Добра.

Дзед звярнуў у завулак налева, а Лявонка пайшоў проста. Чуць адыйшоў, а ўжо пачуў жаласьлівые прыпевы: „Міленькіе, падайце беднаму, на Бога ўздумайце...“ А было гэта саўсім так, бытцам нехта зверху ў ніз правёў пальцамі па кепска нацягнутых струнах скрыпкі. Лявонка ўздрыгнуў і прыбавіў шагу. Заўсягды яму ня люба было чуць, як дзед стагнаў і маліў, і не раз нават пужаўся, што, як адмовяць, нічога не дадуць, тады дзед тут-жэ і заплачэ.

Кругом было так ціха, бытцам ночкай, толькі да вушэй хлапца ўжо далеталі дзедавы малітвы. Лявонка падыйшоў да плоту і прысеў у ценьку вішні, каторая раскінула над ім свае тонкіе галіны. Негдзе зьвінела пчэла...

Лявонка, скінуўшы торбу с плеч, падлажыў яе пад галаву ды так, гледзячы на небо праз лісьця, хутка заснуў. Цень ад плоту і густые дзядоўнікі зусім закрылі яго ад вачэй прахожых...

Нейкі незвычайны гоман разбудзіў хлапца. Позна ўжо было, бо пацягівало вечэрнім халадком. Нехта плакаў недалёка. А плакаў так, як хліпаюць дзеці. Плач то моўк, то ізноў падыймаўся, а ўсё чуцен быў бліжэй і бліжэй. Падняў Лявонка галаву і скрозь траву паглядзеў на дарогу.

Па ёй ішла прыгожэнькая дзяўчынка, гадкоў семі, ў чыстай опратцы. Твар яе ад сьлёз ажно запух, а яна што раз пацірала яго надалком сваей белай пэркалёвай спаднічкі. Ішла памаленьку, босымі ножкамі шаркала па пяску, падыймаючы пыл і гэтак задумаўшысь, бытцам ня ведала, куды ідзе. Чорные яе вочкі, цяпер вільготные, глядзелі неяк сумна, а маленкіе пекные вушкі як-бы свавольна тырчалі меж растрэпанымі валасамі, што раскінуліся на лоб шыю і плечы.

Лявонцы яна паказалася вельмі сьмешнай і вясёлай, хоць была ў сьлезах. „Ну, і свавольніца!“ — падумаў.

— А чаго плачэш? — спытаўся ён.

Уздрыгнула яна, аглянулася і адразу перэстала плакаць,

усхліпываючы толькі памаленьку. Апасьля ізноў скрывіліся вусны, зморшчыўся твар, ды ўжо моцна пачала галасіць.

Лявонцы зрабілося вельмі жаль дзяўчынкі, ажно у грудзях нешта сціснуло, — і ён пацягнуўся за ёю.

— Годзі плакаць. Ты-ж вялікая ўжо, стыдна! — гукаў ён перш здалёку, а пасьля, дагнаўшы, заглянуў у вочы: — Ну і чаго-ж гэта плакаць?

— Каб на цябе гэтак...—адбуркнула і тут-жэ абсунулася на дарогу; закрыла твар рукамі і плакаць не кідала.



— Баба, чыстая баба!...—махнуў рукой Лявонка.—Цьфу, каб цябе...

Ні ей, ні яму неяк ад гэтых слоў не зрабілося лягчэй. Як пабачыў ён сьлёзы, што капалі памеж яе розовенькімі пальчыкамі, дык і сам замаркоціўся, — ледзь-ледзь не расплакаўся. Нахінуўся і прылажыў руку к яе валаскам, але разам спужаўся сваей адвагі і адняў руку. Яна тымчасам не сціхала, а ўсё плакала ды плакала.

— Ці чуеш?—спагадзя ізноў сказаў Лявонка, бо шкадаваў яе вельмі.—Ну, ці чуеш? Што табе?.. Мо набіў хто?... Скажы!... А мо згубіла што?... Разам пашукаем...

Дзяўчынка ўсё ручкамі закрывала свае вочы і круціла галоўкай, але ня вытрывала і, усхліпываючы, атказала:

— Хустачку... згубіла. Бацька с кірмаша прывёз... сіненькую, ў кветачкі... а я ўзяла ды згубіла.

І заплакала ешчэ мацней, ешчэ горэй: „ай—ай—ай!...“

Лявонка, праканаўшыся, што памагчы ей ня зможэ, прыціх і толькі сумна пачаў угледацца ў пацямнеўшае небо. Дзяўчынку дужа шкадаваў, ажно сумна яму стало.

— Не плач... а мо ешчэ знойдеш!...—прашэптаў ён ізноў, але, прыкмеціўшы, што яна яго зусім нават ня чуе, адсунуўся і пачаў думаць, як гэта бацька задасьць ей за тую хустачку. І бытцам бачыў, як бацька, вялікі чорны казак, бьецъ яе, і як яна бедная аж захліпаецца ад сьлёз, дрыжыць ад страху і валіцца яму ў ногі.

Ня мог устаяць і адыйшоў колькі крокоў, але ізноў вярнуўся і успёрся на плот. Хацеў канешне усцешыць яе хоць якім ласкавым словам.

— Устань, ідзі лепей у хату... прызнайся бацьцы, што згубіла, і ўсё. Дужа шкадуеш?..

Гаварыў ён гэта мягка, ціха і рад быў, што яна паслухала і ўстала.

— Во, і добра! Ідзі ў хату, а не, то я с табой пайду, акуратна ўсё скажу і заступлюся нават. Ня бойся!

1 Лявонка важна ускінуў плечыма ды аглядзеўся навокол.

— Ня трэба...—прашэптала малая ды, стрэпянуўшы пыл з спаднічкі, манілася ўжо ісьці.

Цяпер ён важна стаяў перэд ёю; разставіў ногі, што аж лахмоцьця неяк падняліся. Пастуківаў палкай і не зводзіў з яе сваіх вачэй, каторые зіхацелі гордасьцю і адвагай.

Дзяўчынка паглядзела спадылба і, размазываючы па твару сьнёзы, сказала:

— Ня трэба... не ідзі... мамка ня любіць бедных.

І пайшла адна дарогай, аглянуўшыся разы са два.

Маркотна зрабілося Лявонцы. Ён з дзябёлаго, гордаго непрыкметна стаў ціхім, згорбіўся, перэкінуў торбу з рук на плечы ды гукнуў дзяўчынцы, што хавалася ўжо за вуглом:

— Будзь здарова!

Тая аглянулася і счэзла з вачэй.

Вечэр надходзіў, і ў паветры была гэткая душната, якая заўсягды бывае перад бурай. Сонцэ ўжо было зусім нізка; адны толькі вярхушкі тополей ў ім зіхацелі, а доўгіе цені, ў каторых хаваліся галіны дрэў, здавалося, разшыралі і выцягівалі іх пні... Небо дужа пацямнело, бытцам хто бархат расцягнуў над зямлёй. Толькі чутно было у адным баку гоман людзей, а у другім, як песьню пеялі. Зусюль веяло душнатой.

Хлапцу трохі стало страшно аднаму,—захацелося к дзеду; пашукаў яго вачамі і пабег нацянькі. Жэбраваць яму зусім не хацелося. Чуў толькі, што сэрцэ неяк моцна бьецца, што ногі падкашываюцца, а галава атказываецца думаць. Але аб дзяўчынцы ніяк ня мог забыць, усё аб ёй думаў... Дзе яна цяпер? У хаці, ці не? Ці багатые яны? Калі багатыры, дык пабьюць... усе яны скупые; а калі бедные, то падчас і даруюць. У бедных семьях даражаць дзяцьмі, чэкаюць ад іх помачы. Адна за аднэй думкі мучылі галоўку яго, шчамілі сэрцэ, ды ўсё цяжэй рабілося яму на душы...

А вячэрняя цемнь тымчасам гусьцела, і ў паветры рабілося ешчэ душней. Па дарозі сустрэчаў казакоў, але яны прахадзілі міма, не глядзелі на яго, бо ўжо прывыклі к розным галодным валакітам з Расеі. Ён сваімі тухлымі вочкамі глядзеў на іх і шыбка ішоў к цэркві, крыжы каторай ужо сьвеціліся праз лісьця.

Насупроціў яго ляцеў гоман вертаўшагося стада. Вось і цэрква ўжо паказалася—малая, прысадзістая, пamалеваная на сіні колер; кругом яе былі пасаджэны топалі, ды такіе высокіе, што перэрасьлі нават крыжы, якіе чырвоным агнём зіхацелі ў апошніх блесках захадячаго сонца.

Вось ідзе і дзед. Схіліўся пад сваей торбай, прылажыў руку да лба і шукае свайго ўнука.

За дзедам ідзе десяцкі станіцы, пастуківае палкай і нешта бармочэ.

— Ну, што, пустая торба?—спытаўся дзед унука, каторы ўжо чэкаў яго ля цэркоўнаго плата.

— А я вось колькі сабраў! — крэхчучы скінуў дзед с плеч акуратна набітую торбу.

— Ах... і шчыра тутака дарaць!.. Ах, як шчыра!.. А ты чаго надуўся?

— Галава неяк баліць...—ціха атказаў Лявонка.

Абодвы прыселі на узгорку і апёрліся плечамі аб цэглы, што былі зложэны ля плота. Дзед з нейкай радасьцю гладіў торбу, набітую уселякім дабром.

— Што?... Замарыўся?... Пойдзем пашукаць начлегу. А як зваць гэтаго казака? А?

— Андрэй Чорны.

— Але, Андрэй Чорны! Гэтак мы і папытаемся, дзе жыве той Андрэй Чорны. Вось ідзе чэлавек, яго і папытаемся. А які сыты народ, усюды пшанічны хлеб! Здароў, будзь чэлавечэ!

Казак проста к ім падыйшоў і памаленьку атказаў:

— І вы будзьце здаровы!

Апасьля разставіў шырока ногі, вытрашчыў на іх свае вялікіе бытцам шкляные вочы, ды ўсё моўчкі чэсаўся.

Лявонка прытна глядзеў на яго, дзед міргаў сваімі старымі сьлепнямі, а казак маўчаў, высалупіў толькі язык, ды ўсё стараўся ім злавіць кончык вуса свайго. А злавіўшы—жваў яго ды ізноў выпіхаў з губы сваей. Наканец такі надумаўся і буркнуў ляніва:

— Ну... пойдземо у зборню.

— Чаго?—атклікнуўся неспакойна дзед.

Лявонка так увесь і затросся.

— Трэба... Прыказано. Ну!

Павярнуў ды маніўся ўжо ісьці, але як аглянуўся і убачыў. што яны з мейсца нават не кратаюцца, гукнуў сярдзіта:

— Ну, чаго чэкаеце?!

Тады дзед і Лявонка шыбка ўсталі і пайшлі за ім.

Лявонка паглядываў на дзеда і, прыкмеціўшы, што губа і рукі яго неяк трасуцца і што шукае нешта за пазухай, адразу уцяміў, што дзед напэўна ізноў правініўся, як гэта ўжо калісь было. Стало яму страшна, адразу ўспомніў усю тую бяду... Тады дзед сцягнуў з двара бялізну, але тут жэ яго і злавілі. Крывілі, лаялі, нават білі, а пасьля, хоць ночка стаяла, выгналі іх з станіцы. А ноч была гэткая цёмная... Начэвалі яны нейдзе на пяску ля самога мора. А морэ тады цэльную ночку дужа страшна плёскало, і вада з гэткай сілай набегала на бераг, што аж пясок скрыпеў... Дзед усю ноч маліўся, зваў сябе злодзеем і прасіў Бога даравацъ яму гэтае зладзейства, не караць ешчэ...

— Лявонка...

Дзед штурхнуў хлопца пад бок; той аглянуўся. Твар дзеда зрабіўся неяк шэрым, нос выцягнуўся, а губа дрыжала.

Казак ішоў у перадзі, курыў люльку, збіваў палкай галоўкі пападаўшагося зельля і зусім на іх не глядзеў.

— На, бяры!... кінь... у крапіву... а прыкмець, куды кінеш... каб апасьля ўзяць...—ледзь чутно прашэптаў дзед, шчыльна прысунуўся к хлопчыку і ткнуў яму ў руку нейкі чырвоны камок.

Лявонцы аж мароз прабег пад скурай. Падсунуўся блізенька к плоту, дзе расла вісока крапіва, і, паглядываючы на шырокіе плечы казака, выцягнуў руку ды кінуў у крапіву тую шмаціну... Кінуў і самлеў.

Шмаціна, як падала, шырока развярнулася, і пабачыў тады Лявонка сіненькую с кветкамі хустачку, а за ёй бытцам угледзіў усю у сьлезах маленькую дзяўчынку. Стаяла

перад ім як раз як жывая і гэтак сабой закрыла яму ўсё — і казака, і дзеда... Плач яе ізноў зазьвінеў у яго вушах, і здалося яму, бытцам тутака—перад ім — капаюць на зямлю сьветлые яе сьлёзкі, каторые закрываюць яму ўвесь сьвет і студзяць яго грудзь, бытцам кусочкамі лёду...



Гэтак, як самлеўшы, ледзь ён валок свае ногі за дзедам у зборніцу. Чуў ужо, як там усе гаманілі, але не хацеў, а нават ня мог разабраць іх гутаркі. Пасьля бытцам праз туман бачыў, як высыпаліся кусочкі дзедава хлеба, як яны ўдарыліся мягка і глуха аб стол... Дужа многа нейкіх галоў у вісокіх шапках тырчало кругом стала. А шапкі і галавы былі чорные, хмарные, ды ешчэ тое прыкмеціў, што яны ўсё ківаліся і гразілі... Пасьля два дужые дзяцюкі падхапілі дзеда ды гэтак ім затрасьлі, што той аж захарчэў:

— Да душы, ня вінен!... Ня вінен, мае міленькіе... Бог жэ тое бачыць!...

Лявонка заплакаў і абсунуўся на зямлю.

Узяліся тады за яго: паднялі, пасадзілі на лаўку і перэтрасьлі ўсё яго шкуцьцё.

— Маніць Даніліха, чортава баба!—гэтак гукнуў нейкі казак сваім грубым сярдітым голасам, ды бытцам ударыў Лявонку па вушох.

— А хто іх там ведае? Можэ яны дзе і схавалі?—загаманілі іншые ешчэ крапчэй.

Хлапцу здалося, што гэтымі словамі бьюць яго па галаве, ды гэтак моцна, што ён зусім самлеў, бытцам нырнуў у чорную, глыбокую—без дна—студню.

Як трохі ачухаўся, то пабачыў, што галоўка яго ляжыць на дзедавых каленах, а сам дзед нахінуўся над ім ды плачэ мутнымі маленькімі сьлезамі, каторые плылі яму на шэйку і дужа казыталі... Дзедавы твар, здавалося, паморшчыўся ешчэ крапчэй, як заўсёды.

— Дзякаваць Богу, ачунеў... Пойдземо, діцятка, адгэтуль,—выпусьцілі праклятые!

Лявонка падняўся і сеў поплеч; але цяжка яму было сідзець, бо здавалося, што ў галаве ёсць нешта вельмі цяжкое і што вось-вось яна зара і зваліцца с плеч... Узяў яе абапол ды пачаў памаленьку качаць з боку на бок.

— Што, баліць? Родненькі ты мой!... Намучылі яны нас... Проста зьверы! Згінуў кінджал, згубіла дзеўка сваю хустачку, а яны ўсё на нас, ды на нас!... Божухна ты мой, Божухна!.. за што нас караеш?!.

Пісклівы голас дзеда ажно скрэбаў Лявонку ў нутры, і пачуў ён, што тамака загараецца гэткая вострая іскра, каторая бытцам аддаляе яго ад дзеда.

Ён адсунуўся і спадылба глянуў на старога; здалося яму, што з маршчын выпаўзаюць маленькіе благіе гадзюкі кламства... Уздрыгнуў і паглядзеў навокол...

Сядзелі яны на дарозі за станіцай—у цяньку, пад дубам. Ужо ноч была,—ўзыйшоў месяц; а малочна-серэбраный сьвет яго слаўся па пустому стэпу і навадзіў сумную жуду. Далёка—там, дзе земля схадзілася з небам, падыймаліся цёмные хмары і ціха плылі па небі; падчас захадзілі на месяц, а тады па зямлі прабегалі доўгіе цені. А было іх шмат; яны шчыльна клаліся на зямлю, памаленьку плылі па ёй ды неўзнак гінулі, бытцам у нейкіе шчыліны праваліваліся.

З станіцы далеталі ешчэ галасы; дзенедзе сьвеціліся аганькі і бытцам міргалі зоркам на небі.

— Пойдземо, дзіцятка!.. трэба ісьці,—сказаў дзед.

— Ой, хочэцца пасядзець!...—ціха прашэптаў Лявонка.

Яму падабаўся стэп. Ідучы у дзень, любіў ён глядзець наперад, туды, дзе небо бытцам кладзецца на шырокую грудзь зямлі... І сьніліся яму там аграмадные гарады з добрымі людзьмі, каторые самі хлеб даюць,—прасіць ня трэба. А калі падхадзіў бліжэй і бачыў такую самую станіцу, як усе, тады нейк злосна яму рабілося за гэтае ашуканство. А на другі дзень, як шырокі стэп ізноў развертаўся перад яго вачамі, ён ізноў востра угледаўся, ці не пабачыць дзе тых гарадоў...

Вось і цяпер задумаўся ды глядзеў у даль, адкуль па маленьку надыходзілі цёмные хмары. Яны здаліся яму дымам с тысяч коміноў гэтаго горада, што ён дужа хацеў пабачыць...

Цяжкі, глухі кашэль ацуціў хлопца.

Дзед ад кашлю захліпаўся, сьлёзы ліліся, губа раскрылася, вочы высалупіліся, ды ўвесь твар стаў нейкім страшным—незвычайным,—і другі раз запалілася ў Лявонцы тая іскорка, што яго аддаляла ад дзеда.

— Ну, пасядзім, пасядзім ешчэ!...—ледзь выгаварыў дзед, ды нешта пачаў шукаць за пазухай.

Лявонка адвярнуўся ды ізной пачаў глядзець у даль.

— Лявонка!.. Паглядзі!..—разам радасна ўсхліпнуў дзед, і ў руцэ яго мігнуло нешта доўгае, дужа бліскучае.—Ручка сераэбраная, да душы серэбраная!... поўсотні каштуе!...

А ўвесь дрыжаў,—і ад грудной болі, і ад хцівасьці.

Лявонка адпіхнуў працягнутую к яму руку.

— Схавай, дзядуля!.. схавай!.. — трывожна пачаў прасіць.

— Ну, і чаго спужаўся, дурніца ты гэткі?!.. Чаго? Нікога нема!... Я ў вакно зірк, аж ён вісіць.. я яго хап, ды пад палу... а пасьля ў кустах схаваў... І дурные яны!.. І хустачку ўзяў... во яна!..

Выцягнуў с торбы і патрос хустачкай перад вачамі хлопца.

Перад Лявонкай як бы разарвалася завеса, і ён бытцам пабачыў гэткі абраз:—Ён і дзед шыбка сьпешаць па вуліцы станіцы, адварочываюцца ад людзей і баяцца іх. Лявонцы здаецца, што кожны мае права іх біць, плююць ім у вочы, лаяць іх... Усе—хаты, дрэвы, плоты—ў нейкім дзіўным тумане ківаюцца грозна... Гудзяць неяк страшэнна галасы... А дарога доўгая, выходу не відаць; хаты с цёмнымі вокнамі бытцам находзяць на іх, хочуць задушыць, ды падчас то атхінаюцца, то ізноў маняцца крывіць... З аднаго вокна чуцен выразна крык: „Зладзеі! Зладзеі! Зладзеі!..“ Лявонка зірк у тое вакно, ды пабачыў усю у сьлезах дзяўчынку, каторую раней ён хацеў бараніць... Яна угледзіла яго і высунула язык, а сіненькіе яе вочкі дужа калолі душу Лявонкі, бытцам іголкі...

Абраз той паказаўся на адзін момэнт і зара згінуў, але ўзбунтаваў Лявонку проці дзеда.

Дзед то гукаў, то кашляў, махаў рукамі, сьмеяўся, трос галавой і абціраў пот, каторы абліваў яго паморшчэны лоб.

Густая, як-бы парваная хмара зацягнула месяц, і цень закрыў дзедавы твар. Лявонцы здалося, што тая дзяўчынка стаіць поплеч,—і вось пачаў ён іх раўнаваць. Слабы, пісклівы,

хцівы, абарваны дзед пры сьвежай, маладзенькай, прыгожай дзяўчынцы—здавалося—быў зусім непатрэбны на сьвеці ды сярдзіты, як у казках. За што ён яе скрыўдзіў? Як жэ гэта можна было? Ён ей ня родны...

А дзед скрыпеў:

— Каб сто рублёў... сабраць!.. Памёр-бы тады спакойна...

— Маўчы!.. разам крыкнуў Лявонка.—Памёр-бы... а ўсё жывеш, не паміраеш... крадзеш толькі!.. — крыкнуў ды скочыў зусім бледны.—Стары ты злодзей!... У-у—і пачаў трасьці сваім малым кулаком перад дзедавым носам. Апасьля сеў і праз зубы ўжо цэдзіў:—Дзіця абакраў... вельмі пекна!.. Стары, а гэтак робіш... Не даруюць табе на тым сьвеці!..

Разам ускалыхнуўся стэп, падуў вецер, і месяц сваім сінім сьветам абліў увесь стэп, каторы паказаўся дужа глыбокім. Туман пачаў хістацца і скора зусім згінуў.. Ударыў пярун і разыйшоўся грохат... Небо і земля задрыжалі... Набегла куча густых хмар і праглынула месяц.

Зрабілося цёмна. Нейдзе далёка бліснула бліскавіца, і спагадзя загудзеў гром.. Апасьля сціхло,—здаецца, ўсё сціхло на векі.

Лявонка жэгнаўся. Дзед сідзеў, нават не уздрыгнуў, прыпёрся толькі шчыльна к дрэву, бытцам зросся з ім.

— Дзядуля!..—прашэптаў Лявонка, са страхам чэкаючы, як гэта зара ударыць пярун.—Поўдзем у станіцу..

Небо ізноў задрыжало, бліснуў сіні агонь, загрохатало, бытцам праехаў нейдзе воз з жалезам.

— Дзядуля!..—крыкнуў Лявонка.

Голас яго зьвінеў, як разбіты збанок, ледзь чутны за грохатам пяруноў.

— А што... ўнучок ты мой... спужаўся...—ня рухаючыся з мейсца сіпла прашэптаў дзед.

У яго словах чутно было скаргу і боль. Лявонцы здалося, што гэта гукае нехта другі.

Пачалі падаць вялікіе каплі вады, ды неяк таемна, бытцам асьцерэгалі людзей... Здалёку дык ужо і моцна шумеў дождж. А тутака кожная капля падала асобна і памірала без эха. Гром грымеў усё бліжэй, бліскавіцы часьцей перэбегалі па небі.

— Ня пойду назад у станіцу! Хай мяне, злодзея, сабаку... тутака дождж зальеццъ... хай пярун спаліць!—усхліпываючы гукаў дзед.—Ня пойду!.. Ідзі!..—Вось яна дзе!.. Ідзі!.. Не хачу, каб ты тутака сядзеў.. пайшоў!.. Ідзі!.. Ідзі сабе!..

Дзед ужо ня гукаў, а крычаў сіпла.

— Дзядуленька!.. даруй... ня гневайся!.. — падпоўзшы пачаў прасіць Лявонка.

— А!.. Ня пойду!.. Не дарую... Сем год я цябе няньчыў!.. Усё дзеля цябе... і жыў... дзеля цябе. І што мне трэба?.. Я паміраю, вось глядзі... зара памру... а ты зладзеем мяне лаеш... А на што я краў?.. Табе... ўсё табе кіну... Вось, бяры... бяры... Хацеў, каб ты меў на ўвесь свой век... і краў... Бог усё бачыць... Ён ведае... што краў... ведае... Пакарае мяне... Не памілуе мяне, старога сабаку... за зладзейства. І пакараў ужо... і навучыў ужо... Божухна мой, дужа ж крэпка навучыў ты мяне... Рукой дзіцяці ты забіў мяне... Гэтак і варта!.. Справедлівы ты, Божэ!.. Іду ўжо на суд Твой... Пасылай за душой маей... Ох!.. вось і... ўсё!.

Голас дзеда, як дротам, кальнуў у сэрцэ хлопчыка, і страх холадам абняў яго.

Пяруны безадпачынку грымелі, трасьлі небам і зямлёй, адзін аднаго перэганялі, каб шыбчэй злучыцца ды пагукаць з зямлёй. Бліскавіцы памінутна разрывалі небо, стэп дрыжаў, ды па ім перэбегаў то блеск, то пакрывала цемнь. А бывало, што толькі негдзе далёка засьвеціць маланка—без гроху, бытцам не было там буры.

Паліў дужа густы дождж Яго каплі ад бліскавіц сьвеціліся, як ніткі з сталі, ды зусім закрылі агні ў станіцы.

Лявонка заміраў ад страху і сьцюжы. Гэта ён скрыўдзіў дзеда. Уцяміў ён сваю віну з сумных зыкаў яго голасу. Лявонка угледаўся ў адно мейсцэ, ды баяўся міргнуць нават тады, калі с прамокшай галавы сьцекала вада, і каплі яе спадалі ў вочы; увесь заслухаўся ў ціхі голас дзядулі, што гінуў за грохатам пяруноў.

Лявонка прыкмеціў, што дзед сідзіць, як палена, нават не кратаецца,—і здалося яму тады, што трэба уцекаць, кінуць дзеда. Ён ціханька, неўзнак, падпоўз к дзеду, прыткнуўся к яму локцем ды зара моцна ўздрыгнуў, бо чэкаў чагось дужа стражнаго.

Блікнула маланка і на момэнт усё асьвяціла, абліла і іх сваім сьветам, іх-мокрых, скорчэных, маленькіх, залітых вадой, што з галін дрэва сплывала...

Дзед развадзіў рукамі, бо дух яму ўжо спёрло; а ўсё ешчэ барматаў.

Лявонка заглянуў у яго твар і разам закрычаў, так спужаўся: ад сіняго сьвету бліскавіцы паказаўся ён мёртвым, вочы бяльмом ужо захадзілі...

— Дзядуленька!.. Пойдзем!..—страшэнна крыкнуў хлопец, ды схаваў сваю галоўку памеж кален дзеда.

Дзед ешчэ пахіліўся, абняў яго сваімі тонкімі, крывымі рукамі, прыцісвуў моцна к сабе і узвыў, як воўк, што трапіў у жалезы.

Той вой вельмі спужаў хлапца; ён ледзь не звар'яцеў, вырваўся і пабег проста, як стрэла; бліскавіцы асьляплялі



яго—нічога ня бачыў; то валіўся, то ізноў падыймаўся і што раз далей гінуў у цемнаце, раздзіранай памінутна блескамі новых бліскавіц і маланак. Хлопец бег і бег, проста адурэўшы са страху...

А дождж ішоў, неяк сьцюдзёна шумеў, шумеў безжаласно... І здалося падканец, што на стэпі ніколі нікога больш не было апрача бліскавіц ды грохату пяруноў...

---

Назаўтра раніцай станічные дзеці пабеглі на пожню гуляць, але зара вярнуліся, падвялі трывогу ды пачалі ўсім расказываць, што яны бачылі ўчэрашняго дзеда ля шляху пад дрэвам. А пэўне яго зарэзалі, бо ляжыць побач і кінджал.

Як старые казакі прыйшлі глядзець, дык выйшло, што не так. Дзед ешчэ зіпаў. Пабачыўшы, што ідуць людзі, хацеў падняцца, але ня мог. Мову яму адняло, і ён толькі вачамі ўсіх пытаў і кагосьці шукаў імі у грамадзе; але не знайшоў, каго шукаў, дый ніхто нічога яму не атказаў...

Пад вечэр памёр, і закапалі яго там, дзе знайшлі,—пад дрэвам. Казалі, што на могілках хаваць нельга, бо раз што

ён чужы, ды ешчэ і злодзей, і памёр без пакуты. Ля дзеда ў балоце знайшлі і кінджал, і хустачку.

Прайшлі два дні,—знайшлі і Лявонку.

За станіцай над аднэй ямай дужа пачалі кружыцца вароны. Пайшлі людзі глядзець, што іх там прынаджывае, і знайшлі хлопчыка. Той нежывы з раскінутымі ручкамі лежаў на дне ямы—у гразі, што асталася пасьля дажджу.

Перш думалі пахавадь яго на могілках, бо быў ешчэ малы, але пасьля адумаліся і пахавалі ля дзеда — пад дрэвам. Насыпалі узгорак і паставілі каменны крыж.



Напісаў **М. Горкій**.

З расейскаго перэлажыла **Зязюля**.

Рысункі **Яніслава Валакіты**.

# БЕЛАРУСКАЯ ВЫДАУНІЦКАЯ СУПОЛКА

*„Загляне сонцэ і у нашэ ваконцэ“*

**Пецербург 6 лінія дом № 1 кв. 20.**

**Суполка выдала і ўзяла на склад:**

Беларускі лемэнтар 6 к. з рыс.
Першае чытаньне 6 кап. з рыс.
Другое чытаньне 25 кап.
Гутаркі аб небе і зям. 15 кап. з рыс.
Жалейка Я. Купалы 50 кап. лепш. выданьне 80 к.
Цукер В. Тройцы 3 кап.
Гутаркі аб гаспадарцы 3 к.
Як ратаваць уздутую жывёлу 3 кап з рыс.
Дым Конопніцкай 4 кап.
Вязанка Я. Лучыны 4 кап.
Казкі А. К. 6 кап.
Казка аб вадзе 3 кап.
Тарас на Парнасе 5 кап.
Гедалі Э. Ожэшковай 6 к. з рыс.
Зямельная справа ў Новай Зеляндіі 3 кап.
Як бараніцца ад халеры А. Гр. 1 кап.

Biełaruski lementar 6 k. z rys.
Pieršaje čytańnie 6 kap. z rys.
Pan Tadeuš Marcinkiewiča 25 k. lepš. wydańnie 50 k.
Hapon Marcinkiewiča 15 kap. lepš. 30 kap.
100 prykazak, zahadak ect. 13 k.
Cukier W. Trojcy 3 k.
Jak ratawać uzdutuju žywiołu 3 k. z rys.
Gedali E. Ožeškowaj 6 k. z rys.
Ziamielnaja sprawa ŭ Nowaj Zelandii 3 k.
Kazka ab wadzie 3 k.
Taras na Parnasie 5 k.
Jak baranicca ad chalery A. Hr. 1 kap.
Karotki katechizm 5 k.

1964

# ВЫДАНЬНЯ
# „НАШАЕ НІВЫ"

№ 1 і 2. **Зямельная справа ў Новай Зэляндыі** цэна 3 кап.
№ 3 і 4. **Ожэшко. Гэдалі,** з рысункамі — цэна 6 кап.
№ 5 і 6. **Бэльлямі.** Казка аб вадзе—цэна 3 к.
№ 7 і 8. **Вацюк Тройца. Цукер** — цэна 3 к.
№ 9 і 10. **Гутаркі аб гаспадарцы**— цэна 3 к.
№ 11 і 12. **А. Гр. Як бараніцца ад халеры**—цэна 1 кап.
№ 13 і 14 Першы Беларускі **Календар „Нашае Нівы" на 1910 г.** Цэна 15 к. с перэсыл. 20 к.
№ 15 А хто там ідзе ? Беларуская песьня з нотамі Словы Янука Купалы. Музыка Л. М. Рогоўскаго цэна 10 кап.

Склад пры канторы газэты **„Наша Ніва"**
**у Вільні, Віленская вуліца д. № 20.**

# ВЫДАЎНІЦКАЯ СУПОЛКА
# „НАША ХАТА"

## выдала пакуль што такіе кніжкі:

**№ 1. М. Конопніцка ДЫМ,** з рысункамі — цэна 4 кап.
**№ 2. ТАРАС на ПАРНАСЕ**—цэна 5 кап.
**№ 3 Ядвігін Ш. Дзед Завала** цэна 5 кап.
**№ 4. Як будаваць добрые рамовые вульлі.** Цэна 5 кап.

Выдаўніцтво „ПОЛОЧАНІН"

**№ 1. Альбэрт Паўловіч „СНАПОК"** (зборнік вершоў цэна 15 кап.

Усе гэтые кніжкі можна выпісываць праз кантору рэдакц і „Наша Ніва" Вільня, Віленская вуліца № 20. Малые грошы, да рубля, можна пасылаць пачтовымі маркамі; хто выпісывае адразу за рубель за перэсылку не плаціць. Для гандляроў робіцца уступ а.

Бел.



**Цэна 8 кап.**

**Глаўны склад: Вільня, Георгіевскій праспэкт, 4, кв. 10 кантора „НАШАЕ ХАТЫ“.**

Друкарня Марціна Кухты, Вільня, Дворцовая 4.